ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# ГОМЕЛЬСКІ УНІВЕРСІТЭТ

№ 7 (1020) | ЧАЦВЕР, 11 красавіка 2002 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

## "САЮЗ БЕЛАРУСІ І РАСІІ: РЭАЛІІ І ПЕРСПЕКТЫВЫ"

— такой тэме была прысвечана 2 красавіка г.г. абласная навукова-практычная канферэнцыя, прымеркаваная да Дня яднання народаў дзвюх братніх краін. Яна прайшла на базе Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны.

Канферэнцыю адкрыў і цёпла павітаў яе ўдзельнікаў прарэктар ГДУ па навуковай рабоце прафесар Д.Р.Лін.

На пленарным пасяджэнні заслуханы даклады: старшыні Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў, кандыдата эканамічных навук В.С.Сяліцкага — "Геапалітычнае значэнне інтэграцыйных працэсаў паміж Беларуссю і Расіяй"; загадчыка кафедры беларускай мовы, прафесара А.А.Станкевіч — "Аб стварэнні Міжнароднага інстытута гісторыі і культуры ўсходнеславянскіх народаў"; дацэнта кафедры гісторыі Беларусі, кандыдата гістарычных навук І.Ф.Эсмантовіча — "Саюзная дзяржава Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі. Рэальнасць і перспектывы".

Затым на канферэнцыі працавалі секцыі: "Фарміраванне адзінай эканамічнай і прававой прасторы як асновы эфектыўнага функцыянавання саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі"; "Гістарычны і палітычны аспекты інтэграцыйных працэсаў у рамках саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі"; "Саюзная дзяржава як фактар паскоранага развіцця сацыяльнай сферы: адукацыі, аховы здароўя, культуры, экалогіі". На секцыях заслухана і абмеркавана каля 20 навуковых паведамленняў, з якімі выступілі навукоўцы ГДУ, Беларускага гандлёва-эканамічнага універсітэта спажывецкай кааперацыі, БелДУТа, кіруючыя работнікі абласных органаў адукацыі , аховы здароўя, культуры, экалогіі.

Навукова-практычная канферэнцыя, арганізатарамі якой сталі Гомельскі аблвыканкам і ГДУ імя Ф.Скарыны, выклікала ў яе ўдзельнікаў зацікаўленасць і шэраг актуальных пытанняў.

## ДАР АКАДЭМІКА БІБЛІЯТЭЦЫ

У апошнія гады студэнты нашага універсітэта, як і некаторых іншых ВНУ краіны, востра адчуваюць недахоп неабходнай вучэбнай літаратуры па многіх дысцыплінах. Таму будучыя матэматыкі і іх выкладчыкі вельмі ўдзячны акадэміку Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі І.В.Гайшуну, які перадаў у фонд бібліятэкі ГДУ па некалькі экземпляраў сваіх падручнікаў "Уводзіны ў тэорыю лінейных нестацыянарных сістэм" і "Сістэмы з дыскрэтным часам". У першай з названых кніг сістэматычна выкладзена тэорыя лінейных неаўтаномных сістэм. Пры гэтым з аднаго пункту гледжання вывучаецца паняцце прывядзення сістэмы адносна розных груп пераўтварэнняў. У другой кнізе чытач знойдзе найбольш поўнае ізлажэнне асноўных пытанняў тэорыі як лінейных, так і нелінейных дынамічных сістэм з дыскрэтным часам. Абодва падручнікі зацікавяць кожнага, хто вывучае тэорыю дыферэнцыяльных ураўненняў, матэматычную тэорыю кіравання, механікі, тэорыі імпульсных сістэм і матэматычнага мадэлявання. Для карыстання іх можна атрымаць у чытальнай зале і бібліятэцы ў вучэбным корпусе № 2.

**У.АРЛОЎ,**
**дэкан матэматычнага факультэта, дацэнт;**
**У.МІРОНЕНКА,**
**загадчык кафедры дыферэнцыяльных ураўненняў, прафесар.**

## ШЫРЫЦЦА КОЛА СЯБРОЎ У РАСІІ

Да Дня яднання народаў Беларусі і Расіі значную работу правёў Беларускі патрыятычны саюз моладзі нашага універсітэта. БПСМ устанавіў кантакты са многімі расійскімі маладзёжнымі арганізацыямі, выступіў ініцыятарам стварэння расійска-беларускага маладзёжнага руху "За Саюз Расіі і Беларусі". Гэта ініцыятыва была падтрымана моладдзю па ўсёй Расіі. Цяпер наладжваюцца абмены студэнцкімі групамі, ажыццяўляюцца сумесныя праграмы ў галіне культуры, спорту, турызму, студатрадаўскага руху. Гэта ўзаемаразуменне і ўзмацненне сяброўства даказваюць многія сотні юнакоў і дзяўчат, якія штогод сабіраюцца ў маладзёжных лагерах "Адзінства" і "Дружба".

Працэс яднання нашых народаў не абыходзіцца без цяжкасцей. Таму менавіта маладым належыць накіроўваць сваю энергію на тое, каб рэалізаваць волю нашых народаў жыць адзінай сям'ёй. Яднанне моладзі Беларусі і Расіі – залог нашага дабрабыту ў будучым.

**І.КАЗАКОЎ,**
**сакратар пярвічнай арганізацыі БПСМ ГДУ імя Ф.Скарыны.**

## НА САВЕЦЕ УНІВЕРСІТЭТА

Першым на парадак яго чарговага пасяджэння было вынесена пытанне аб выніках зімовай залікова-экзаменацыйнай сесіі. З інфармацыяй выступіла начальнік вучэбнага аддзела Н.І.Папкова. Яна адзначыла, што паказчыкі гэтай сесіі аказаліся некалькі вышэйшымі, чым былі на той жа час у мінулым годзе. Адначасова ўказана і на некаторыя прабелы.

Аб выкананні Калектыўнага дагавору за 2001 год Савет праінфармавалі першы прарэктар універсітэта А.П.Кармазін, старшыня прафкама Г.І.Варатніцкі і старшыня прафкама студэнтаў Н.І.Колтышава. У Калектыўны дагавор унесены некаторыя змяненні і дапаўненні, якія перш за ўсё закранаюць пытанні сацыяльнага забеспячэння.

Аб арганізацыі курсавога і дыпломнага праектавання на эканамічным факультэце далажыла яго дэкан дацэнт Т.В.Карпей.

Заслухана і прынята да ведама справаздача аб гаспадарчай дзейнасці за 2001 год рэспубліканскага навукова-вытворчага ўнітарнага прадпрыемства "Лазерныя тэхналогіі", з якой выступіў яго дырэктар А.Ц.Малашчанка.

На пасяджэнні Савета былі разгледжаны таксама некаторыя іншыя пытанні універсітэцкага жыцця, па якіх прыняты адпаведныя рашэнні.

## *ВІНШУЕМ!*

*Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты філалагічнага факультэта горача віншуюць з выпадку прысуджэння БелВАКам вучонага звання прафесар загадчыку кафедры рускага,агульнага іславянскага мовазнаўства доктару філалагічных навук* ***КОВАЛЮ Уладзіміру Іванавічу*** *і вучонага звання дацэнт кандыдату філалагічных навук з кафедры рускай літаратуры* ***УСОЛЬЦАВАЙ Таццяне Мікалаеўне.***

## *З УЗНАГАРОДАЙ!*

За шамтгадовую добрасумленную навукова-педагагічную дзейнасць і ў сувязі з 60-годдзем з дня нараджэння загадчык кафедры дыферэнцыяльных ураўненняў прафесар **МІРОНЕНКА Уладзімір Іванавіч** узнагароджаны Ганаровай граматай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

* * *

За шамтгадовую плённую працу, добрасумленнае выкананне службовых абавязкаў Ганаровай граматай універсітэта ўзнагароджана галоўны бухгалтар **КУРАВА Іраіда Антонаўна.**

*Літаратурнае братэрства*

## "НАД ДНЯПРОМ, ДЗЯСНОЙ І СОЖАМ"

Чароўны, дзіўны і непаўторны свет паэзіі... А ці задумваліся вы калі-небудзь над тым, што азначае гэтае таямнічае слова? І хто гэтыя людзі – паэты, таленавітым пяром якіх ствараюцца заварожваючыя чалавечую душу цудоўныя радкі? Напэўна, няпроста адназначна адказаць на гэтыя пытанні. Часам нават для саміх творцаў складана даць поўнае і вычарпальнае азначэнне. Паэзія напрацягу свайго доўгавекавога існавання заўсёды суадносілася з нечым чыстым, светлым, духоўным. Яна і зараз дапамагае чалавеку стаць больш чулым і добрым, узбагачае асобу маральна, напаўняючы яе адчуваннем сваёй непаўторнасці, глыбіні.



Студэнты-філолагі нашага універсітэта мелі магчымасць ва ўсёй паўнаце адчуць значнасць уздзеяння паэзіі на святце "Над Дняпром, Дзяснoй і Сожам", арганізаваным Гомельскім абласным выканаўчым камітэтам і абласным аддзяленнем Саюза беларускіх пісьменнікаў. Яно адбылося ў канцы сакавіка, у Міжнародны дзень паэзіі. Узгаданы літаратурны вечар меў на мэце не толькі ўславіць прыгажосць і веліч паэтычнага слова, але і ў чарговы раз праілюстраваць моц, непарушную сілу дружбы трох братніх народаў – беларускага, рускага і украінскага. На святце паэзіі ў ГДУ прысутнічалі госці з чарнігаўскай зямлі Васіль Будзённы і Сяргей Канаваленка, член Саюза пісьменнікаў Расіі Фелікс Мысліцкі, прадстаўнікі творчага кола Гомельшчыны, выпускнікі нашага універсітэта Эма Усціновіч, Ніна Шклярава, Таіса Мельчанка, Ларыса Раманава, а таксама Ганна Атрошчанка, Генадзь Говар, Тамара Кручэнка (супрацоўніца газеты "Гомельская праўда"), Юрый Фатнеў, светлагорскія паэты Ізяслаў Катляроў і Соф'я Шах, старшыня абласнога аддзялення Саюза беларускіх пісьменнікаў Васіль Ткачоў.

Паэтычныя радкі, што гучалі на адметна прывабнай украінскай, стройнай і строгай рускай, мілагучнай і роднай беларускай мовах, былі зразумелы аднолькава ўсім прысутным. Адчуванне еднасці, пачуццё непарушнага трыадзінства славянскіх душ захапіла слухачоў, паглынула на пэўны час усе перашкоды і непаразуменні, што так ці інакш паўстаюць на шляхах суседніх краін-сясцёр. Тэме духоўнай еднасці нашых народаў прысвяцілі свае вершы В.Будзённы і Ю.Фатнеў. Цуд кахання, маладосці, неабходнасць цаніць кожнае імгненне, падоранае жыццём, прагучалі ў паэтычных радках Л.Раманавай і Н.Шкляравай. Праблема захавання і развіцця нацыянальнай мовы таксама не засталася па-за ўвагай мастакоў слова. Праз усё жыццё пранесці любоў да роднай беларускай мовы, зберагчы і перадаць агонь гэтага пачуцця сваім нашчадкам – вось у чым бачаць сэнс чалавечага існавання Т.Мельчанка і Т.Кручэнка.

Напрыканцы сустрэчы прагучалі вершаваныя пажаданні ад творчай сям'і І.Катлярова і С.Шах, у якіх паэты заклікалі студэнтаў, усіх удзельнікаў сустрэчы заставацца заўсёды сапраўднымі людзьмі, каб "апраўдаць сябе не толькі перад небам, але і перад зямлёй".

**М.СТРАХА,**
**студэнтка гр. БА-23 філфака.**

**На здымку: выступае паэт з г.Чарнігава Васіль Будзённы.**
**Фота У.Чысціка.**

*Культурнае жыццё*

## УЗНАГАРОДЫ ЗА МАЙСТЭРСТВА

У гарадскім цэнтры культуры па вул. Першамайскай адбыўся фестываль самадзейнай мастацкай творчасці калектываў Цэнтральнага раёна, прысвечаны 860-годдзю г.Гомеля. Наш універсітэт на ім прадстаўлялі народныя калектывы — фальклорна-харэаграфічны "Радзімічы" (кіраўнік А.Лысянкоў), фальклорны — "Валошкі" (кіраўнік А.Эбзеева), а таксама студэнцкі тэатр эстрадных мініяцюр "13-ы факультэт" і 5 салістаў-вакалістаў студэнцкага маладзёжнага клуба.

Студэнцкія таленты змаглі праявіць сябе на высокім узроўні, скласці дастойную канкурэнцыю астатнім калектывам-удзельнікам фестывалю з прадпрыемстваў "8 Сакавіка", "Спартак", музычнага каледжа імя Сакалоўскага і інш.

Лаўрэатамі фестывалю сталі ансамблі "Радзімічы" і "Валошкі". Першы прызнаны лепшым харэаграфічным калектывам, другі высока ацэнены за захаванне нацыянальных традыцый.

Ганаровыя Дыпломы пераможцам уручыў кіраўнік адміністрацыі Цэнтральнага раёна І.А.Барадзінчык. Удзельнікі калектываў атрымалі таксама каштоўныя падарункі: фотаапарат і тэлефон.

**(Наш кар.)**

## *У СВЯТА ТЭАТРАПАЎ*

27 сакавіка ў 40-ы раз адзначаўся Міжнародны дзень тэатра. Да гэтай юбілейнай даты тэатр-студыя "Если бы..." (рэжысёр-пастаноўшчык Г.Варонін) на сцэне актавай залы нашага універсітэта ў другі раз паказаў спектакль па п'есе "Нехта ходзіць за акном..." вядомага гомельскага драматурга Васіля Ткачова. Студэнты-акцёры заслужылі, як знак прызнання тэатральнага майстэрства, дружныя апладысменты гледачоў.

Пасля спектакля Г.Варонін па добрай традыцыі ўручыў членам народнага творчага калектыву, якія сёлета атрымаюць дыпломы і развітаюцца з універсітэтам, памятныя падарункі ад прафкама студэнтаў. Уладальнікамі сувеніраў сталі Святлана Гандыш з біяфака, Вольга Сухамера — з філфака, Алена Грачова і Дзяніс Міхайлаў — з матфака.

**(Наш. кар.)**

# ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ імя Ф.СКАРЫНЫ

## АБ'ЯЎЛЯЕ ПРЫЁМ СТУДЭНТАЎ НА І КУРС ДЗЁННАГА АДДЗЯЛЕННЯ 2002/2003 НАВУЧАЛЬНАГА ГОДА

1. В университет принимаются граждане Республики Беларусь и белорусы, проживающие за её пределами, граждане Российской Федерации, Республики Казахстан, Киргизской Республики, Республики Таджикистан, а также лица, постоянно проживающие на территории республики или имеющие статус беженца.

Указанные категории лиц имеют право получить в университете на базе среднего образования на конкурсной основе бесплатное высшее образование, если образование данного уровня получается впервые.

Граждане других зарубежных стран принимаются в университет на основе межгосударственных соглашений или договоров с оплатой обучения.

**2. Приём заявлений с 25 июня по 15 июля. Вступительные экзамены осуществляются в два потока: первый – с 16 по 23 июля, второй – с 24 по 31 июля.** Определение проходного и полупроходного баллов и доведение их до сведения абитуриентов – 2 августа; зачисление абитуриентов, набравших проходной балл и представивших оригиналы всех необходимых документов, – 4 августа; определение кандидатов на зачисление из числа абитуриентов, набравших полупроходной балл и доведение до сведения абитуриентов, – 5 августа; зачисление кандидатов на зачисление, представивших оригиналы всех необходимых документов, – 7 августа; зачисление на условиях оплаты обучения – до 31 августа.

3. Поступающие в университет подают в приёмную комиссию или присылают по почте с указанием первого или второго потока следующие документы:

– заявление установленного образца на имя ректора;

– оригинал либо нотариально заверенную копию или ксерокопию (ксерокопия заверяется приемной комиссией по представленному оригиналу):

– документа государственного образца о среднем образовании,

– сертификата централизованного тестирования (для тех, кто прошел централизованное тестирование и поступает на следующие специальности: «Автоматизированные системы обработки информации» – засчитываются результаты централизованного тестирования по следующим испытаниям – физика (устно), математика (письменно), белорусский (русский) язык и литература; «Геология и разведка месторождений полезных ископаемых» – математика (устно), белорусский (русский) язык и литература; нефилологические специальности – белорусский (русский) язык и литература),

– медицинской справки по форме 086У,

– заключения врачебно-квалификационных комиссий (для инвалидов I-III групп, а также детей-инвалидов),

– выписки из трудовой книжки (для тех, кто работает),

– справки исполкома сельского Совета, подтверждающей постоянное проживание в сельских населенных пунктах не менее двух лет,

– справки из службы занятости населения (для тех, кто находится на её учёте);

– 6 фотографий размером 3х4.

Абитуриенты, поступающие не в год получения среднего образования, обязаны представить документы, которые подтверждают их работу или учёбу за годы, предшествующие поступлению (диплом, выписку из трудовой книжки, справку из службы занятости населения и др.).

Одновременно представляются документы, которые подтверждают право абитуриентов на льготы, установленные законодательством Республики Беларусь, или свидетельствуют о личных талантах и способностях абитуриентов.

Паспорт или другое свидетельство личности, выданное органами МВД Республики Беларусь, предъявляются в приёмную комиссию абитуриентом лично.

4. Университет осуществляет приём студентов сверх плана приёма на условиях договоров с оплатой обучения юридическими или физическими лицами. На места сверх плана приёма по конкурсу зачисляются:

– абитуриенты, которые положительно сдали вступительные испытания, но не прошли по конкурсу в университет на бюджетные места;

– лица, прошедшие обучение на подготовительном отделении университета, по итогам совмещенных выпускных и вступительных экзаменов;

– абитуриенты, которые имеют направления предприятий (организаций) и положительно прошли собеседование по предметам вступительных испытаний.

| Специальности | Экзамены | Конкурсный или неконкурсный |
|---|---|---|
| | **Первый поток – с 16 по 23 июля** | |
| Белорусская филология | 1.Белорусский язык (диктант)<br>2.Белорусский язык и литература (устно)<br>3.Русский язык и литература (устно) | 1. Конкурсный<br>2. Конкурсный<br>3. Конкурсный |
| Белорусская филология со специализацией «Литературная работа в газетах и жур-налах» | 1.Белорусский язык (диктант)<br>2.Белорусский язык и литература (устно)<br>3.Русский язык и литература (устно) | 1. Конкурсный<br>2. Конкурсный<br>3. Конкурсный |
| Белорусская филология со специализацией "Английский язык " | 1.Белорусский язык (диктант)<br>2.Английский язык (устно, с аудированием и лексико-грамматическим тестом)<br>3.Белорусский язык и литература (устно) | 1. Конкурсный<br>2. Конкурсный<br>3. Конкурсный |
| Иностранные языки (английский язык) | 1.Английский язык (письменно)<br>2.Английский язык (устно)<br>3.Белорусский (русский) язык и литература (изложение) | 1. Конкурсный<br>2. Конкурсный<br>3. Конкурсный |
| Иностранные языки (немецкий язык) | 1.Немецкий язык (письменно)<br>2.Немецкий язык (устно)<br>3.Белорусский (русский) язык и литература (изложение) | 1. Конкурсный<br>2. Конкурсный<br>3. Конкурсный |
| Математика | 1.Математика (устно)<br>2.Математика (письменно)<br>3.Белорусский (русский) язык и литература (изложение) | 1. Конкурсный<br>2. Конкурсный<br>3.Неконкурсный |
| Прикладная математика (научно-производственная и научно-педагогическая деятельности) | 1.Математика (устно)<br>2.Математика (письменно)<br>3.Белорусский (русский) язык и литература (изложение) | 1. Конкурсный<br>2. Конкурсный<br>3.Неконкурсный |
| Психология | 1.Математика (устно)<br>2.Человек и общество (устно)<br>3.Белорусский (русский) язык и литература (изложение) | 1. Конкурсный<br>2. Конкурсный<br>3.Неконкурсный |
| История | 1.История Беларуси (устно)<br>2.Иностранный язык (устно)<br>3.Белорусский (русский) язык и литература (изложение) | 1. Конкурсный<br>2. Конкурсный<br>3.Неконкурсный |
| История. Английский язык | 1.История Беларуси (устно)<br>2.Английский язык (устно, с ауди-рованием и лексико-грамматичес-ким тестом)<br>3.Белорусский (русский) язык и литература (изложение) | 1. Конкурсный<br>2. Конкурсный<br>3.Неконкурсный |
| Физика (научно-производственная и научно-педагогическая деятельности) | 1.Физика (устно)<br>2.Математика (устно)<br>3.Белорусский (русский) язык и литература (изложение) | 1. Конкурсный<br>2. Конкурсный<br>3.Неконкурсный |
| Физика. Техническое творчество | 1.Физика (устно)<br>2.Математика (устно)<br>3.Белорусский (русский) язык и литература (изложение) | 1. Конкурсный<br>2. Конкурсный<br>3.Неконкурсный |
| Физическая культура | 1.Экзамен по специзподготовке<br>2.Биология (устно)<br>3.Белорусский (русский) язык и литература (изложение) | 1. Конкурсный<br>2. Конкурсный<br>3.Неконкурсный |
| | **Второй поток – с 24 по 31 июля** | |
| Русская филология | 1.Русский язык (диктант)<br>2.Русский язык и литература (устно)<br>3.Белорусский язык и литература (устно) | 1.Конкурсный<br>2.Конкурсный<br>3.Конкурсный |
| Русская филология со специализацией "Белорусский язык и литература" | 1.Русский язык (диктант)<br>2.Русский язык и литература (устно)<br>3.Белорусский язык и литература (устно) | 1.Конкурсный<br>2.Конкурсный<br>3.Конкурсный |
| Бухгалтерский учёт, анализ и аудит | 1.Математика (устно)<br>2.Иностранный язык (устно)<br>3.Белорусский (русский) язык и литература (изложение) | 1.Конкурсный<br>2.Конкурсный<br>3.Неконкурсный |
| Экономика и управление на предприятии | 1.Математика (устно)<br>2.Иностранный язык (устно)<br>3.Белорусский (русский) язык и литература (изложение) | 1.Конкурсный<br>2.Конкурсный<br>3.Неконкурсный |
| Коммерческая деятельность | 1.Математика (устно)<br>2.Иностранный язык (устно)<br>3.Белорусский (русский) язык и литература (изложение) | 1.Конкурсный<br>2.Конкурсный<br>3.Неконкурсный |
| Финансы и кредит | 1.Математика (устно)<br>2.Иностранный язык (устно)<br>3.Белорусский (русский) язык и литература (изложение) | 1.Конкурсный<br>2.Конкурсный<br>3.Неконкурсный |
| Мировая экономика | 1.Математика (устно)<br>2.Иностранный язык (устно)<br>3.Белорусский (русский) язык и литература (изложение) | 1.Конкурсный<br>2.Конкурсный<br>3.Неконкурсный |
| Физическая электроника | 1.Физика (устно)<br>2.Математика (устно)<br>3.Белорусский (русский) язык и литература (изложение) | 1.Конкурсный<br>2.Конкурсный<br>3.Неконкурсный |
| Автоматизированные системы обработки информации | 1.Физика (устно)<br>2.Математика (письменно)<br>3.Математика (устно)<br>4.Белорусский (русский) язык и литература (изложение) | 1.Конкурсный<br>2.Конкурсный<br>3.Конкурсный<br>4.Неконкурсный |
| Геология и разведка месторождений полезных ископаемых | 1.Математика (устно)<br>2.География (устно)<br>3.Белорусский (русский) язык и литература (изложение) | 1.Конкурсный<br>2.Конкурсный<br>3.Неконкурсный |
| Правоведение | 1.Математика (устно)<br>2.Человек и общество (устно)<br>3.Иностранный язык (устно)<br>4.Белорусский (русский) язык и литература (изложение) | 1.Конкурсный<br>2.Конкурсный<br>3.Конкурсный<br>4.Неконкурсный |
| География | 1.География (устно)<br>2.Математика (устно)<br>3.Белорусский (русский) язык и литература (изложение) | 1.Конкурсный<br>2.Конкурсный<br>3.Неконкурсный |
| Геоэкология | 1.География (устно)<br>2.Математика (устно)<br>3.Белорусский (русский) язык и литература (изложение) | 1.Конкурсный<br>2.Конкурсный<br>3.Неконкурсный |
| Биология | 1.Биология (устно)<br>2.Химия (устно)<br>3.Белорусский (русский) язык и литература (изложение) | 1.Конкурсный<br>2.Конкурсный<br>3.Неконкурсный |

**Собеседование проводится с 21 по 22 августа. Приём заявлений от абитуриентов, поступающих в университет на условиях договоров с оплатой обучения, осуществляется с 7 по 16 августа.**

5. Все вступительные экзамены, за исключением экзамена по белорусскому или русскому языку и литературе для поступающих на нефилологические специальности, являются конкурсными. Они (кроме экзамена по спецфизподготовке) проводятся по программам, которые составлены в соответствии с учебными программами средней общеобразовательной школы (базовый уровень) и утверждены Министерством образования Республики Беларусь. Экзамены проводятся с оценкой знаний по шестибалльной (2; 3; 3,5; 4; 4,5; 5), а на специальность «Автоматизированные системы обработки информации» – по десятибалльной системе (1, 2, 3, 4, 5, 6, 7, 8, 9, 10).

6. Для всех абитуриентов обязательным является письменный вступительный экзамен по белорусскому или русскому языку и литературе, который абитуриенты сдают по выбору.

Экзамен по иностранному языку абитуриенты могут сдавать на выбор, независимо от того, какой иностранный язык они изучали в среднем учебном заведении.

При поступлении на специальности "Белорусская филология" со специализацией «Английский язык», «Иностранные языки», «История. Английский язык» необходимо сдавать экзамен по иностранному языку, который соответствует специальности.

7. Абитуриенты, которые не явились на экзамен без уважительных причин или получили неудовлетворительную оценку («2» по шестибалльной системе или «1», «2» по десятибалльной системе), а также которые забрали документы, к дальнейшим экзаменам не допускаются.

8. Апелляции по вопросам экзаменационных оценок подаются ответственному секретарю приёмной комиссии на имя ректора в день проведения устного экзамена или в день объявления оценки по письменному экзамену. Повторная сдача экзамена не разрешается.

9. Зачисление проводится среди лиц, которые представили в установленные сроки в приемную комиссию оригиналы необходимых документов, перечисленных в пункте 3.

10. Зачисление на все специальности проводится по отдельному конкурсу среди выпускников городских, а также сельских школ и профессионально-технических учебных заведений сельскохозяйственного профиля (которые постоянно проживают не менее двух лет в сельских населенных пунктах) пропорционально поданным заявлениям в соответствии с количеством баллов, набранных абитуриентами на конкурсных вступительных экзаменах. В тех случаях, если конкурсный балл среди выпускников сельских школ равен или превышает конкурсный балл среди выпускников городских школ, зачисление проводится по общему конкурсу.

Конкурс проводится по специальностям, кроме специальностей "Физика" и «Прикладная математика», где конкурс проводится по видам деятельности, и специальностей «Русская филология» и «Белорусская филология», где конкурс проводится по специализациям.

При приёме на нефилологические специальности засчитываются результаты централизованного тестирования по белорусскому (русскому) языку и литературе. При приеме на специальности «Автоматизированные системы обработки информации» и «Геология и разведка месторождений полезных ископаемых» засчитываются результаты централизованного тестирования в соответствии с представленными сертификатами по следующим испытаниям: «Автоматизированные системы обработки информации» – физика (устно), математика (письменно), белорусский (русский) язык и литература (изложение), «Геология и разведка месторождений полезных ископаемых» – математика (устно), белорусский (русский) язык и литература (изложение).

11. Совмещенные выпускные и вступительные экзамены для слушателей подготовительного отделения проводятся в срок с 17 по 30 июня. С результатами совмещенных экзаменов они могут участвовать в конкурсе на целевые места и места сверх плана приёма на условиях договоров с оплатой обучения юридическими и физическими лицами.

Лица, которые прошли обучение через другие формы довузовской подготовки при университете, поступают на общих основаниях.

12. Лица, закончившие среднее общеобразовательное учебное заведение с медалью, среднее специальное учебное заведение или ПТУ (на основе базовой школы с получением среднего образования) с дипломом с отличием:

а) при поступлении на специальности "Математика", "Физика", "Физика. Техническое творчество", «Физическая электроника», «Геология и разведка месторождений полезных ископаемых», "Биология" зачисляются после сдачи вступительного экзамена по профилирующей дисциплине (указана в перечне вступительных экзаменов первой) на оценку «4,5» или «5», а при получении другой положительной оценки сдают остальные вступительные экзамены и участвуют в общем конкурсе;

б) при поступлении на другие специальности сдают все вступительные экзамены.

13. Победители международных и республиканских (диплом первой степени) предметных олимпиад школьников, учащихся средних специальных и профессионально-технических учебных заведений, проведенных Министерством образования в текущем учебном году, а также лица, награжденные нагрудным знаком лауреата специальных фондов Президента Республики Беларусь по социальной поддержке одаренных учащихся, студентов и талантливой молодежи зачисляются без вступительных экзаменов при поступлении на соответствующие специальности.

14. Перечисленные в пункте 13 лица при поступлении на другие специальности, а также победители республиканских предметных олимпиад (диплом второй и третьей степени), победители (I, II, III места) областных предметных олимпиад 2001-2002 учебного года, поступающие на соответствующие специальности, освобождаются от сдачи вступительного экзамена по соответствующему предмету с выставлением оценки «пять» (по шестибалльной системе) или «десять» (по десятибалльной системе).

15. Победители республиканских предметных олимпиад (диплом второй и третьей степени) и победители (I, II, III места) областных предметных олимпиад 2001-2002 учебного года, поступающие на соответствующие специальности и закончившие среднее общеобразовательное учебное заведение с медалью, зачисляются без вступительных экзаменов.

16. Победители областного конкурса по техническому творчеству 2001-2002 учебного года при поступлении на специальность "Физика. Техническое творчество" освобождаются от сдачи вступительного экзамена по физике с выставлением оценки «пять»; победители областной олимпиады школьников по информатике при поступлении на специальности «Прикладная математика» и «Автоматизированные системы обработки информации» освобождаются от сдачи вступительного экзамена по математике с выставлением оценки «пять» (по шестибалльной системе) или «десять» (по десятибалльной системе).

17. Вне конкурса при получении положительных оценок на вступительных экзаменах зачисляются:

– воины-интернационалисты;

– дети-сироты и дети, оставшиеся без опеки родителей;

– дети из семей военнослужащих или рабочих и служащих, занимавших штатные должности в воинских частях, и погибших (умерших) или ставших инвалидами во время прохождения воинской службы или работы в составе советских войск на территории государств, где велись боевые действия, а также дети из семей военнослужащих, погибших (умерших) в мирное время при прохождении воинской службы;

– дети из семей лиц начальственного и рядового состава органов внутренних дел, погибших (умерших) или ставших инвалидами при исполнении служебных обязанностей на территории государств, где велись боевые действия, а также погибших (умерших) в мирное время при исполнении служебных обязанностей;

– дети из семей лиц начальственного и рядового состава органов финансовых расследований Республики Беларусь, погибших (умерших) при исполнении служебных обязанностей;

– инвалиды I и II групп, а также дети-инвалиды, которым в соответствии с заключением медико-реабилитационных экспертных комиссий не противопоказано обучение в ВУЗе и которые могут посещать занятия;

– лица, которые имеют льготы в соответствии со ст.18 Закона Республики Беларусь «О социальной защите граждан, потерпевших от катастрофы на Чернобыльской АЭС». Абитуриенты этой категории, которые закончили учебные заведения с отличием (с отличными оценками) зачисляются по результатам собеседования по предметам вступительных экзаменов. Собеседование проводится 12 июля;

– белорусы зарубежья по рекомендациям белорусских организаций или учебных заведений зарубежья на специально выделенные органами управления учебными заведениями места в рамках контрольных цифр приема.

18. При равенстве конкурсных баллов преимущество имеют:

– инвалиды III группы при отсутствии медицинских противопоказаний;

– лица, которые имеют льготы в соответствии со ст.19, 20, 23, 24, 25 Закона Республики Беларусь «О социальной защите граждан, потерпевших от катастрофы на Чернобыльской АЭС»;

– уволенные в запас военнослужащие, имеющие льготы, установленные законодательством, и рекомендации воинских частей;

– лица, имеющие стаж работы не менее двух лет;

– медалисты средних общеобразовательных учебных заведений, отличники средних специальных учебных заведений и ПТУ на основе базовой школы, а также отличники ПТУ на основе средней школы при поступлении на специальности, соответствующие полученным профессиям;

– выпускники 2002 года подготовительного отделения университета при поступлении на соответствующие специальности;

– профессионально ориентированные абитуриенты (закончили факультет довузовской подготовки и профориентации по профилю избранной специальности, имеют стаж работы по специальности, соответствующей избранной, или другую профессиональную ориентацию).

19. На математическом, физическом, филологическом и экономическом факультетах подготовка осуществляется по системе бакалавр-специалист-магистр.

20. Университет осуществляет целевой прием. Зачисление абитуриентов на условиях целевой подготовки специалистов осуществляется согласно доведенных планов целевого приема и соответствующего положения. Зачисление выпускников Брагинского, Буда-Кошелёвского, Ветковского, Добрушского, Ельского, Кормянского, Лельчицкого, Наровлянского, Хойникского, Чечерского районов, награжденных «золотой» или «серебряной» медалью, поступающих в университет на педагогические специальности на условиях целевого приёма, осуществляется по результатам собеседования. Собеседование проводится с 11 по 12 июля.

21. Для получения второго высшего образования принимаются лица на условиях полной оплаты обучения. Порядок зачисления этих лиц определяется соответствующим положением.

22. Все другие вопросы, связанные с приёмом, окончательно решаются приёмной комиссией университета на основе законодательства Республики Беларусь и "Правил приёма в высшие учебные заведения Республики Беларусь на 2002 год".

23. Документы направлять по адресу: 246019, г. Гомель, ул. Советская, 104, Гомельский госуниверситет им. Ф.Скорины, приёмная комиссия. Телефоны: 56-73-38 (приёмная комиссия), 57-69-17 (ответственный секретарь).

**ПРИЕМНАЯ КОМИССИЯ**

| Предмет | Соответствующая специальность |
|---|---|
| Русский язык и литература | Русская филология |
| | Русская филология со специализацией "Белорусский язык и литература" |
| Белорусский язык и литература | Белорусская филология |
| | Белорусская филология со специализацией «Литературная работа в газетах и журналах» |
| | Белорусская филология со специализацией "Английский язык" |
| Английский язык | Иностранные языки (английский язык) |
| | Белорусская филология со специализацией "Английский язык" |
| | История. Английский язык |
| Немецкий язык | Иностранные языки (немецкий язык) |
| Математика | Математика |
| Информатика | Прикладная математика (научно-производственная и научно-педагогическая деятельности) |
| | Автоматизированные системы обработки информации |
| История | История |
| | История. Английский язык |
| Физика | Физика (научно-производственная и научно-педагогическая деятельности) |
| | Физика. Техническое творчество |
| | Физическая электроника |
| География | Геология и разведка месторождений полезных ископаемых |
| | География |
| | Геоэкология |
| Биология | Биология |
| Химия | Биология |

## Экзамен по специальной физической подготовке

Исходным положением экзаменов по специальной физической подготовке является определение уровня общефизической подготовки и двигательного аппарата абитуриентов.

Сдача экзаменов начинается с дифференцированного зачета по плаванию и при успешной его сдаче абитуриенты продолжают сдавать экзамен по специальной физической подготовке. Он включает нормативы и требования спортивного многоборья, в котором предусмотрено выполнение четырех обязательных видов физических упражнений в соответствии с существующими правилами соревнований.

Результат каждого вида физических упражнений оценивается в зачетных баллах (см. таблицу). В таблице также показаны нормативы и требования к зачету по плаванию. Дистанцию можно проплыть одним из существующих спортивных стилей плавания, предусмотренных спортивной классификацией.

Необходимо отметить, что выполнение любого спортивного норматива четырехборья ниже зачетного оценивается двумя ("2") баллами, которые не являются зачетными и не входят в общую сумму балльной оценки за экзамен.

Таким образом, оценка по специальной физической подготовке состоит из суммы результатов только зачетных баллов, набранных абитуриентом в спортивном многоборье.

От 18 до 20 баллов – 5 (пять)
От 16 до 17 баллов – 4,5 (четыре с половиной)
От 14 до 15 баллов – 4 (четыре)
От 12 до 13 баллов – 3,5 (три с половиной)
От 10 до 11 баллов – 3 (три)

## Критерии оценки абитуриентов по специальной физической подготовке

| № п/п | Виды многоборья | Возраст | Нормативные требования и зачетные баллы | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | Мужчины | | | | | Женщины | | | | |
| | | | 5 | 4.5 | 4 | 3.5 | 3 | 5 | 4.5 | 4 | 3.5 | 3 |
| 1 | Бег 100м (сек) | 17-29 | 12.6 | 12.8 | 13.1 | 13.3 | 13.6 | 14.5 | 15.0 | 15.5 | 16.0 | 16.5 |
| | | 30 и более | 13.0 | 13.2 | 13.5 | 13.7 | 14.0 | 15.0 | 15.5 | 16.0 | 16.5 | 17.0 |
| 2 | Бег 1000м (мин, сек) | 17-29 | 3.05 | 3.07 | 3.10 | 3.15 | 3.20 | 3.52 | 4.01 | 4.10 | 4.20 | 4.30 |
| | | 30 и более | 3.15 | 3.20 | 3.25 | 3.30 | 3.35 | 4.10 | 4.20 | 4.30 | 4.45 | 5.00 |
| 3 | Метание гранаты (м) | 17-29 | 48.0 | 46.0 | 44.0 | 41.0 | 38.0 | 32.0 | 30.0 | 27.0 | 25.0 | 22.0 |
| | | 30 и более | 45.0 | 43.0 | 41.0 | 38.0 | 35.0 | 27.0 | 25.0 | 22.0 | 20.0 | 18.0 |
| 4 | Подтягивание в висе на перекладине хватом сверху (кол-во раз) | 17-29 | 16 | 14 | 12 | 10 | 8 | - | - | - | - | - |
| | | 30 и более | 13 | 11 | 9 | 7 | 5 | - | - | - | - | - |
| | Сгибание и разгибание рук в упоре лежа (сгибание рук не менее 90°, кол-во раз) | 17-29 | - | - | - | - | - | 28 | 25 | 22 | 18 | 14 |
| | | 30 и более | - | - | - | - | - | 22 | 20 | 18 | 14 | 10 |
| * | *Плавание 100м (мин, сек)* | | | | | | | | | | | |
| – | Вольный стиль | 17-29 | 1.32 | 1.40 | 1.47 | 1.55 | 2.02 | 1.38 | 1.46 | 1.53 | 2.01 | 2.08 |
| | | 30 и более | 1.42 | 1.50 | 1.57 | 2.05 | 2.12 | 1.48 | 1.56 | 2.03 | 2.11 | 2.18 |
| – | Брасс | 17-29 | 1.45 | 1.53 | 2.00 | 2.08 | 2.15 | 2.03 | 2.11 | 2.18 | 2.26 | 2.33 |
| | | 30 и более | 1.55 | 2.03 | 2.10 | 2.18 | 2.25 | 2.13 | 2.21 | 2.28 | 2.36 | 2.43 |
| – | Кроль на спине | 17-29 | 1.45 | 1.53 | 2.00 | 2.08 | 2.15 | 1.53 | 2.01 | 2.08 | 2.16 | 2.23 |
| | | 30 и более | 1.55 | 2.03 | 2.10 | 2.18 | 2.25 | 2.03 | 2.11 | 2.18 | 2.26 | 2.33 |

* – дифференцированный зачет

**СТАРТЫ СПАРТАКІЯДЫ**

## У ЛІДЭРАХ – ГЕОЛАГІ



Пры добрай арганізацыі прайшлі спаборніцтвы па настольнаму тэнісу ў праграме круглагадовай спартакіяды нашага універсітэта. За ўзнагароды змагалася 80 тэнісістаў з усіх факультэтаў.

У мужчынскім турніры пераможцай выйшла каманда геалагічнага факультэта (капітан — першакурснік Яраслаў Герасімаў). Другімі і трэцімі прызёрамі сталі адпаведна студэнты юрыдычнага і матэматычнага факультэтаў. Сярод жанчын першы радок у турнірнай табліцы заняла каманда эканамічнага факультэта (капітан — чацвёртакурсніца Наталля Цуканава). Тэнісісты факультэта фізічнай культуры і матфака адпаведна на другім і трэцім месцах. Прызёры спаборніцтваў узнагароджаны дыпломамі і салодкімі прызамі — тартамі.

* * *

Вялікую цікавасць у гледачоў выклікалі адкрытыя спаборніцтвы па армрэстлінгу, якія ўваходзяць у праграму круглагадовай спартакіяды. Акрамя нашых спартсменаў за ўзанагароды змагаліся студэнты БелДУТа, медінстытута і тэхналагічнага універсітэта імя П.О.Сухога. У гэтым відзе спорту выяўлялі мацнейшых звыш 100 юнакоў і дзяўчат.

Сярод жаночых каманд у тройку мацнейшых увайшлі адпаведна студэнткі геалагічнага, філалагічнага і фізічнага факультэтаў, сярод мужчынскіх — юрыдычнага, эканамічнага і геалагічнага факультэтаў. Для пераможцаў зноў былі ўзнагародай дыпломы адпаведных ступеняў і тарты.

**В.МАРЧАНКА.**

**ХВАЛЮЮЧАЯ ТЭМА**

## ДЗЕ Ж УМАЦОЎВАЦЬ ЗДАРОЎЕ?

Становішча ў справе лячэння і аздараўлення жыхароў вобласці ў санаторыях, пансіянатах і Дамах адпачынку рэспублікі зараз вельмі складанае. Аб гэтым ішла размова, у прыватнасці, на семінары старшынь і казначэяў камісій па аздараўленню і санаторна-курортнаму лячэнню навучальных устаноў, арганізацый і прадпрыемстваў Цэнтральнага раёна. У ім прынялі ўдзел прадстаўнікі нашага універсітэта, члены названых камісій старшыня прафкама студэнтаў Н.І.Колтышава і нам. старшыні прафкама Т.А.Валчкова.

Былі заслуханы справаздачы адказных пасадавых асоб аб выніках работы па ўмацаванню здароўя жыхароў Цэнтральнага раёна за мінулы год. У ім — 530 арганізацый і ўстаноў, і калі ўлічыць, што па сацыяльнаму страхаванню на 100 працуючых выдзяляюцца 4 санаторныя пуцёўкі, няцяжка падлічыць, што стаць іх уладальнікамі даволі праблематычна. Таксама многія прадстаўнікі тых катэгорый грамадзян, якія згодна Закона Рэспублікі Беларусь "Аб сацыяльнай абароне грамадзян, што пацярпелі ад катастрофы на ЧАЭС" маюць права на першачарговае выдзяленне пуцёвак, таксама не могуць яго выкарыстаць з-за вельмі нязначнай іх колькасці і ім забяспечваюцца кампенсацыйныя выплаты: за санаторную пуцёўку — 82 тыс., аздараўленчую (Дамы адпачынку, турбазы і інш) — 67 тыс. руб.

Усё гэта звязана з недахопам фінансавых сродкаў у рэспубліцы і наўрад ці становішча хутка зменіцца ў лепшы бок. Наадварот, як адзначалася на семінары, яшчэ меншая колькасць людзей у параўнанні з мінулым годам зможа паехаць сёлета ў санаторыі рэспублікі, не кажучы ўжо пра курорты блізкага замежжа — Туапсе, Еўпаторыю, Сочы, Трускавец.

З-за адсутнасці сродкаў на ўтрыманне, рамонт аздараўленчых лагераў, у якіх дзеці адпачывалі летам, яны будуць зачыняцца, і школьнікам ва ўзросце ад 7 да 14 гадоў нічога не застанецца, як бавіць час дома, калі няма магчымасці выехаць у вёску ці на дачу...

* * *

Дык куды ж паехаць на адпачынак? Адну з магчымасцей, якую можна выкарыстаць пры наяўнасці ўласных сродкаў, прапаноўваюць у прафкаме нашага універсітэта. У пачатку ліпеня арганізоўваецца паездка жадаючых у колькасці 30 чалавек на базу адпачынку пад Адэсай. Праезд аўтобусам з Гомеля да месца назначэння, кошт у абодва бакі — $20. Харчаванне за свае сродкі, да паслуг адпачываючых ёсць кафэ, пражыванне — у летніх доміках ($30).

Жадаючыя правесці 2 тыдні лета каля Чорнага мора могуць падаваць заяву ў прафкам універсітэта. Папярэдне неабходна аформіць дакументы (для дзяцей таксама) для выезду за межы рэспублікі.

**ПРЕДЛАГАЕТ СБЕРБАНК**

## ПЕНСИЯ — БЕЗ ЗАДЕРЖЕК

Избежать потерь времени в ожидании в почтовых отделениях получения своих пенсий (они, к сожалению, стали выплачиваться нерегулярно) пенсионерам можно довольно просто. Те их них, кто работает в университете, и просто жители Центрального района могут открыть **ПЕНСИОННЫЕ ВКЛАДЫ ПОД 33% ГОДОВЫХ** в нашем отделении по ул.Советской, 98, которое обслуживает ГГУ им. Ф.Скорины. Для этого достаточно придти к нам с паспортом и пенсионным удостоверением, оформить пенсионный вклад, после чего сообщить номер своего счета в нашем отделении 321/154 в райсобес.

Этим вы избавите себя от ненужных проблем и волнений, так как пенсию у нас можно будет получать без задержек, в удобное для вас время.

**А.ШАТУНОВ,**
**зав отделением № 321/154**
**АСБ Беларусбанка.**

## АМЕРИКАНСКИЕ СТУДЕНТЫ СПИВАЮТСЯ ИЗ-ЗА ИНТЕРНЕТА

Американские студенты, которые пользуются интернетом, пьют и прогуливают больше, чем их сокурсники, не имеющие доступа в Сеть. Именно к такому результату пришла компания Ikea в ходе исследования, проводимого в университетах США. Как оказалось, разлагающее влияние интернета особенно заметно на девушках: они прогуливают в четыре раза больше, чем те их подруги, которые лишены доступа в Сеть. Кроме того, 92% юношей, которые учатся в университетах и имеют выход в интернет, пьют больше алкоголя, чем их неподключенные коллеги.

Преподаватели американских учебных заведений в панике: они-то думали, что предоставляют студентам удобный инструмент для овладения знаниями... Как сообщает европейская редакция журнала Wall Street Journal, на студентов Европы интернет не оказывает такого разлагающего влияния. Правда, не очень понятно, с чего бы это европейцам быть более сдержанными по сравнению с американцами. Не исключено, что разница тут не в студентах, а именно в интернете: например, британская «повременка» не позволяет особенно сильно «подсесть» на интернет.

### ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ Ф.СКАРЫНЫ

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:

— беларускай мовы — дацэнта, ст. выкладчыка;
— вылічальнай матэматыкі і праграміравання — дацэнта;
— алгебры і геаметрыі — прафесара;
— аўтаматызаваных сістэм апрацоўкі інфармацыі — ст. выкладчыка;
— заалогіі і аховы прыроды — асістэнта;
— фінансаў і крэдыту — заг. кафедры;
— матэматычных праблем кіравання — дацэнта;
— палітычнай сацыялогіі — ст. выкладчыка;
— гісторыі славян і спецыяльных гістарычных дысцыплін — дацэнта.

Тэрмін падачы заяў — не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.

Заявы накіроўваць на адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104.

**РЭКТАРАТ.**

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, калектыў кафедры педагогікі выказваюць глыбокае спачуванне асістэнту **ГАРАДЗЕЦКАЙ Людміле Мікалаеўне** з выпадку напаткаўшага яе гора — смерці **БАЦЬКІ**.

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, калектыў прадпрыемства грамадскага харчавання выказваюць глыбокае спачуванне яго дырэктару **СОЦІЕВАЙ Тамары Міхайлаўне** з выпадку напаткаўшага яе вялікага гора — заўчаснай смерці **ДАЧКІ**.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК — Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 2-14. Тэл. 56-30-71. E-mail: rggu@gsu.unibel.by

Зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь 26 чэрвеня 1996г. Рэгістрацыйны № 263.

Спонсар газеты — прафкам студэнтаў.

Газета набрана и сверстана на настольно-издательском комплексе ИВЦ ГГУ, отпечатана на Республиканском полиграфическом унитарном предприятии "Полеспечать", г.Гомель, ул. Советская, 1.

Якасць друку адпавядае якасці арыгіналаў заказчыка.

Рэдактар Уладзімір БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1300 экз.
Заказ 169.
Падпісана да друку 09.04 2002 г.